Дзяржаўная установа адукацыі
“Крулеўшчынская сярэдняя школа Докшыцкага раёна імя І.П.Ціткова”
Віцебскай вобласці

Абласны этап рэспубліканскага конкурсу
навуковых даследчых краязнаўчых работ навучэнцаў

# Каб у душах жывых
# Яны з мёртвых паўсталі

**(Халакост на Докшыччыне)**

Намінацыя:
Гісторыя роднага краю

***Аўтар**:**Карчэўская Ірына Сяргееўна**, 11 клас*
*Кіраўнік:**Рандарэвіч Наталля Уладзіміраўна***
*настаўнік*
dokshkrulja@mail.ru



**Крулеўшчына**

# Змест


1. Уступ 3
2. Асноўная частка 5
3. Докшыцы і наваколле ў сучаснасці 6
4. Акупацыйны рэжым 7
5. Ахвяры Докшыц 9
6. Параф'янаўская трагедыя 18
7. Бягомльскае гета 31
8. Трагедыя і памяць сем'і Эткіных-Камінскі з Крулеўшчыны 32
9. Праведнікі народаў свету 42
10. Заключэнне 49
11. Дадатакі 50
12. Спіс выкарыстанай літаратуры 57

# Уступ

Штогод 27 студзеня адзначаецца Міжнародны дзень памяці ахвяр Халакоста. Ён зацверджаны 1 лістапада 2005 года на спецыяльным пасяджэнні Генеральнай Асамблеі ААН. За аснову даты быў узяты дзень вызвалення савецкімі войскамі АСВЕНЦЫМА – канцэнтрацыйнага лагера, які ў гады вайны знаходзіўся на тэрыторыі Польшчы.

Сумная статыстыка сведчыць, што за перыяд свайго існавання Асвенцым загубіў каля паўтара мільёна нявінных людзей, у ліку якіх жанчыны і малыя дзеці. Гітлераўцы стварылі маштабную, добра адладжаную сістэму па знішчэнні людзей, якая амаль ніколі не давала збояў. Безперабойна функцыянавалі гета, канцэнтрацыйныя лагеры.

Халакост па праве можа быць названы адным з самых жахлівых і недаравальных злачынстваў, якія калі-небудзь былі здзейснены чалавецтвам. Сёння ўжо амаль немагчыма сказаць аб дакладных лічбах ахвяр Халакоста. Агульнапрынятымі лічацца дадзеныя аб **шасці мільёнах** загубленых лёсаў. Гэты лік фігураваў ў абвінаваўчых заключэннях Нюрнбергскага працэсу. **Шэсць мільёнаў** – гэта толькі сухія лічбы. Гора немагчыма вымераць. За гэтымі лічбамі крыецца боль, адчай, зламаныя лёсы. І гэта нельга забыць.

**Актуальная праблема:** памяць пра жудасныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны павінна жыць у чалавечых душах, каб памылкі мінулага не паўтараліся. Час няўмольны, ён сцірае з людской памяці факты, імёны ...

**Аб’ект даследвання**: Халакост.

**Прадмет даследвання**: Гета на тэрыторыі Докшыцкага раёна.

Гэта частка гісторыі маёй малой радзімы малавывучана да цяперашняга часу. Складанасць работы была ў тым, што вельмі мала захавалася матэрыялаў па гэтай тэме.

**Мэта работы**: захаванне памяці трагічных старонак гісторыі Докшыцкага раёна ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

**Задачы:**

- знайсці, сістэматызаваць і вывучыць матэрыялы пра гета, якія дзейнічалі ў час Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Докшыцкага раёна;

- даследаваць факты учыненых злачынстваў;

- даведацца пра лёс людзей, якім удалося застацца ў жывых;

- пазнаёміць вучняў з сабранымі матэрыяламі на класных гадзінах і агульнашкольных мерапрыемствах, прысвечаных Міжнароднаму дню памяці ахвяр Халакоста абогадавіне Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

Праводзячы даследванне па дадзенай тэматыцы, мы звярнуліся ў першую чаргу да матэрыялаў кнігі «Памяць. Докшыцкі раён», Бягомльскага музея Народнай Славы, успаміны відавочцаў і выкарыстоўвалі наступныя **метады даследавання:**

• эмпірычныя: вывучэнне навуковай, мастацкай і публіцыстычнай літаратуры;

• тэарэтычныя: аналіз дакументаў (рэсурсаў сеткі інтэрнэт), абагульненне, сістэматызацыя.

**Практычная значнасць:** сабраныя звесткі дапамогуць паглыбіць і пашырыць веды аб нашым краі, аб яго ваеннай гісторыі. Матэрыял можа быць выкарыстаны пры правядзенні ўрокаў гісторыі, тэматычных класных гадзін, ўрокаў мужнасці і на занятках аб’яднанняў па інтарэсах турысцка-краязнаўчага кірунку.

# Асноўная частка

**Памяць**

*Загінуўшым ад жорсткасці*
*і нянавісці прысвячаю…*

Па прыступках іду,
Што жыццём нашым сёння завуцца.
Прадчуваю бяду,
Быццам зараз яны абарвуцца…
Востры боль, неспакой,
Штосьці душыць, рве сэрца на часткі.
Памяць сілай сваёй
Не дае ад зямлі адарвацца…
Памяць мёртвых, жывых,
Тых, што спяць неспакойна і сёння.
Памяць тых і другіх,
Што паклалі галовы вайною.
Хтосьці хоча забыць
І пустыя прыступкі пакінуць.
Ці хіба можна змыць
След крывавы тых успамінаў?!
Перайначу жыццё,
Перакрэслю пустыя прыступкі,
Каб не ўпаў у забыццё
Мой народ, не забыў тыя мукі.
Мукі страшныя тых,
Што ў вайну тут галовы паклалі.
Я хачу, каб у душах жывых
Яны з мёртвых паўсталі.

Вольга Адамовіч

# Докшыцы і наваколле ў сучаснасці

Докшыцы − невялікі гарадок у Віцебскай вобласці. Гэта адзін з раённых цэнтраў Віцебшчыны. За 9 км ад Докшыц знаходзіцца вёска Параф’янава. Праўда, ва ўсіх старых дакументах яна называецца мястэчкам. Чаму? Магчыма, для нейкага адрознення. Справа ў тым, што мясцовыя жыхары падзяляюць гэты населены пункт на два Параф’янавы: чыгуначная станцыя, і так званае “старое”, дзе знаходзіца каталіцкі касцёл. Заўсёды станцыя была большай па памерах і больш заможнай вёскай. Яшчэ перад вайной тут было багатае яўрэйскае мястэчка. У Докшыцах таксама жыло шмат яўрэяў. А таксама ў гарадскім пасёлку Бягомль, вёсках Беразіно, Валкалата, Крулеўшчына… На той час ніхто не ведаў, які лёс іх напаткае…




*Сучаная карта Докшыцкага раёна*

## Акупацыйны рэжым

Докшыцкі раён быў цалкам акупаваны нямецкімі войскамі ў ліпені 1941 года. Акупацыя працягнулася 3 гады – да ліпеня 1944 года.

Да пачатку другой сусетнай вайны ў Докшыцах налічвалася каля 3600 чалавек мясцовых жыхароў, з іх габрэяў – 75 %. У горадзе было 106 магазінаў, з якіх толькі 8 дзяржаўных, астатнія належалі гаспадарам-габрэям [1].

Адным з самых жахлівых бакоў фашысцкага акупацыйнага рэжыму быў генацыд у адносінах да асоб габрэйскай нацыянальнасці. Паводле распараджэння Гітлера фашысцкія кіраўнікі загаддзя пачалі распрацоўваць план "канчатковага вырашэння габрэйскага пытання", што азначала знішчэнне ўсіх габрэяў… Па звестках начальніка 4-га аддзела гестапа Эйхмана, якому Гітлер даручыў выкананне гэтай праграмы, на акупаваных тэрыторыях было забіта 6 мільёнаў габрэяў, што складала 1/3 частку габрэяў усяго свету.

Звярыную палітыку знішчэння савецкіх грамадзян габрэйскай нацыянальнасці гітлераўскія галаварэзы з небывалай жорстасцю праводзілі на ўсёй часова акупіраванай тэрыторыі Беларусі, у тым ліку і на Віцебшчыне. Сюды следам за войскамі вермахта прыбылі айнзацкаманды, зондэркаманды, тайная палявая паліцыя (ГФП), паліцыя бяспекі і СД, фельдкамендатуры, ортскамендатуры, жандармерыя і іншыя карныя органы, у абавязкі якіх разам з вермахтам уваходзіла і вырашэнне "габрэйскага пытання". Усе гэтыя органы і часці былі ўкамплектаваны спецыяльна падабранымі асобамі, якія былі выхаваны ў духу нацызму і вызначыліся асаблівай жорсткасцю ў адносінах да людзей іншых нацыянальнасцей. Менавіта яны адразу ж аддзялялі габрэяў ад мясцовых жыхароў, заганялі іх у гета.

Загады палявых і мясцовых камендатур па стварэнні гета выдаваліся паўсюдна: у Бабруйску, Баранавічах, Брэсце, Мазыры, Лідзе, Мінску, Докшыцах, Бягомлі, Параф'янаве і іншых месцах Беларусі. У асноўным ствараліся гета закрытага тыпу. Іх тэрыторыі былі абнесены калючым дротам, ахоўваліся гітлераўскімі салдатамі і паліцыяй.

Паводле распараджэння нямецкіх акупацыйных улад габрэям забаранялася самавольна пакідаць гета, мяняць месца жыхарства і кватэры ў гета, карыстацца тратуарамі, грамадскім транспартам, паркамі і грамадскімі ўстановамі, наведваць школы.

Для габрэяў уводзілася абавязковае нашэнне апазнавальных знакаў – акруглыя латы і шасціканцовыя зоркі жоўтага колеру, нарукаўныя павязкі з шасціканцовымі зоркамі ***(Дадатак 1)***.

Амаль да ліквідацыі гета габрэі павінны былі прымусова выконваць работу для акупантаў, пры якой многія з іх памерлі з-за нечалавечых умоў жыцця і працы, з-за адсутнасці медыцынскай дапамогі ***(Дадатак 2)***[4,5].

Фашысты, рэалізуючы нацысцкую праграму знішчэння габрэяў, стварылі **на тэрыторыі Докшыцкага раёна 3 гета**:

- У гета гарадскога пасёлка **Бягомль** (лета 1941 - 2 кастрычніка 1941 года) былі знішчаны больш за **1000** габрэяў.
- У гета горада **Докшыцы** (лета 1941 - 29 мая 1942 года) былі закатаваныя і забітыя каля **3000** габрэяў.
- У гета вёскі **Параф'янава** (лета 1941 - 31 мая 1942 года) былі забітыя каля **600** габрэяў.

# Ахвяры Докшыц

***Горад Докшыцы*** *– раённы цэнтр у Віцебскай вобласці. Вядомы з 15 стагоддя. У 16-18 ст. - мястэчка Ашмянскага павета Віленскага ваяводства ў складзе Рэчы Паспалітай. З 1793 – у складзе Расійскай імперыі, павятовы горад Мінскай губерніі, з 1796 – мястэчка Барысаўскага уезда Мінскай губ.*

*У 1920-39 – у ваяводстве ў складзе Польшчы, з 1939-91 – у складзе БССР.*

*У 1766 годзе ў Докшыцах пражывала 210 габрэяў, ў 1847 – 1808, ў 1865 – 790, у 1897 – 2762 (75,8%) , у 1931 – каля 4000 чалавек. Асноўныя заняткі габрэйскага насельніцтва ў 19 ст. – рамёствы (распаўсюджана было вязанне панчох). У 1865 годзе мелася 4 сінагогі, у 1910 – 5 сінагог і габрэйскія могілкі. У 1-й палавіне 19 ст. рабінам у Докшыцах быў рабі Мойша-Шлойме-Залман, у 1874 грамадзянскім рабінам – Н.Н.Фридман, духоўным рабінам – Аўраам Лейбавіч Файнблюм, з 1910-га па 1924 год рабінам быў Арон-Шлойме-Залман Зельменовіч. У 1906 у Докшыцах створаны оддяленні ешывы «Томхей-Тмімім», кіраўнік Іегошуа Лейн (? -1941).*

*У сярэдзіне верасня 1915 года казацкія часткі рускай арміі ўчынілі пагром. Рабаванні, збіццё і здзекі працягваліся тры дні, большая частка габрэйскага насельніцтва пакінула Докшыцы, аднак пацярпелі 132 габрэйскія сем'і. У 1920-30-х гг. у Докшыцах дзейнічалі аддзяленні розных габрэйскіх партый і арганізацый.*

*Пасля акупацыі горада нямецкімі войскамі ўлетку 1941 года было створана гета, ліквідаванае 29 мая 1942 (знішчаныя 2653 габрэя).*

Паводле перапісу 1939 г., насельніцтва Докшыц складала каля 3,6 тыс. чалавек, у асноўным гэта былі габрэі. Большасць з іх, калі пачалася вайна, не змагла або не пажадала эвакуіравацца, не верачы чуткам пра выключную жорсткасць нацыстаў у дачыненні да габрэйскага насельніцтва.

Немцы прыйшлі ў горад 2 ліпеня 1941 года (роўна праз тры гады іх адсюль выбілі). Ужо ў верасні нямецкія ўлады выдалі ўказ аб стварэнні гета ў Докшыцах. Зона гета пачыналася ад саду сінагогі і уключала ў сябе некалькі суседніх алей і частку галоўнай вуліцы Касцюшка. Гэта раён горада ўздоўж вуліцы Максіма Горкага, ад сучаснай вуліцы Гайдара да піўзавода Гардона (зараз будынак архітэктуры). Гэты квартал быў абнесены высокім калючым дротам, а ўздоўж вуліцы Савецкая быў збудаваны высокі плот, прычым шчыльны, суцэльны.

Апошнім днём для габрэйскай абшчыны горада стала 29 мая 1942 г., калі гета было «канчаткова ліквідавана», за час існавання якога былі знішчаны 2653 габрэі. Гэтым страшным падзеям прысвечана кніга «Памяць: Докшыцы − Параф'янава», выдадзеная ў 1990 г. на англійскай мове ў Ізраілі. У кнізе занатаваны ўспаміны тых докшыцкіх і параф’янаўскіх габрэяў, якім удалося застацца ў жывых, апавяданні пра тыя жудасныя дні, слёзы і боль па родных і знаёмых.

Барыс Казініц − адзін з нямногіх вязняў Докшыцкага гета, якім выпала ацалець у час яго «ліквідацыі». Яму пашчасціла трапіць да партызан. Ён ваяваў, са зброяй у руках помсціў за пакуты і смерць родных і сяброў. У кнізе «Памяць: Докшыцы – Параф’янава» ёсць і яго ўспаміны.

“Нарадзіўся я ў 1919 г. ў Докшыцах. У 1934 г. паступіў у польскую школу. Потым працаваў у швейнай майстэрні. У 1941 г. быў прызваны ў Чырвоную Армію. Полк наш размяшчаўся ў мястэчку Зэльва, што пад Ваўкавыскам.

На світанку 22 чэрвеня 1941 г. нямецкія войскі парушылі мяжу і ступілі на зямлю Савецкага Саюза. Наш полк з баямі адступаў у напрамку Баранавіч. Дзесьці пад Мінскам мы трапілі ў акружэнне. З яго я выходзіў разам з маім сябрам Молі Уэндам і яшчэ двума салдатамі Чырвонай Арміі. Ішлі лясамі, начавалі ў стагах сена, елі толькі тое, што давалі сяляне. Я ўжо тады з размоў з некаторымі людзьмі ведаў, што немцы вельмі дрэнна адносяцца да габрэяў.

Мне пашанцавала, і 29 ці 30 чэрвеня 1941 г. я змог вярнуцца ў родны горад. Аб’явы, якія ўжо на гэты час былі развешаны на многіх пабудовах горада, загадвалі ўсім былым салдатам з’явіцца да нямецкіх улад. Я быў апрануты ў сялянскую вопратку і таму мог хаваць тое, што быў салдатам у нядаўнім мінулым.

Першымі двума ахвярамі фашыстаў сярод габрэяў былі Мазін, звар’яцелы чалавек, і Маркман, які быў застрэлены ва ўласнай хаце. У ліпені загад насіць жоўтую стужку датычыўся ўжо ўсіх габрэяў.

У гэтыя дні я вярнуўся ў абшчыну і запісаўся на працу. Працуючых збіралі кожную раніцу невялікімі групамі і пасылалі на работу або ў часовыя лагеры. Дысцыпліна там была вельмі строгая. Калі Зальман Раскін на некалькі хвілін спазніўся на работу, яму загадалі паўзці, а нямецкі саддат біў яго 25 разоў. Мы бачылі, як моцны і здаровы Зальман уздрыгваў пры кожным удары. У душы мы пакляліся помсціць і не ўяўлялі, што ў хуткім часе ў горадзе не застанецца ў жывых ніводнага габрэя.

Немцы пачалі адбіраць майстроў для стварэння груп рабочых. Мяне паслалі ў швейную майстэрню, дзе мы працавалі для іх арміі. Ад гэтай работы залежаў мой лёс на працягу ўсяго часу акупацыі. У Докшыцах была прызначана мясцовая адміністрацыя. Галоўным саветнікам немцы назначылі так званага Паўла Кавальскага, начальнікам паліцыі, Комульку, які служыў старшым сяржантам у Польскай Арміі. Ён быў родам з Познані, але гаварыў па-нямецку. У яго падпарадкаванні было 25 паліцэйскіх: браты Войнічы, браты Літвіны, Юхневіч і іншыя. Сваімі жорсткасцямі ў адносінах да габрэяў яны пераўзышлі нават эсэсаўцаў. Комулька быў савецкім вязнем, немцы вызвалілі яго, і тады ён аддана ім служыў. Ужо пасля вайны, у 1951 г., ён быў схоплены і павешаны паводле прыгавору суда ў Познані.

Бургамістрам быў прызначаны Яўген Рыгоравіч Спічонак, які хаваў габрэйскую сям’ю Крамераў (зараз яны жывуць у ЗША). Гэтага добрага чалавека выпадкова застрэлілі партызаны, калі ён ехаў разам з камендантам Докшыц.

Як толькі ў горадзе з’явілася гестапа, у першую чаргу яно «паклапацілася» аб габрэях, якія былі актывістамі савецкай улады. Гэта Гронам Клофт, Абрам Левітан, Зальман Цыклін і іншыя. Пасля чатырох дзён катаванняў яны былі вывезены з горада і расстраляны. Дзе іх магілы − невядома і сёння.

У жніўні 1941 г. фашысты падрыхтавалі наступную групу ахвяр. З таго часу мы сталі атрымліваць усё больш частыя звесткі аб масавых забойствах габрэяў у суседніх мястэчках, такіх як Беразіно, Бягомль. Чаканне жудаснага знішчэння габрэйскага насельніцтва марудна, але настойліва ўваходзіла ў нашу свядомасць.

Усе спецыялісты, якія працавалі на немцаў, атрымалі дазвол (шайнэн) займацца сваёй работай і мелі права выходзіць з гета. Мой бацька і я шылі адзенне для ўлады. Голад паціху падкрадваўся да трох тысяч душ, якія жылі ў гета. 300 г хлеба на чалавека − усё харчаванне, і тое выдавалася нерэгулярна. Каб не спецыялісты, якія маглі выходзіць з гета кожны дзень і купляць або абменьваць каштоўнасці на ежу, гета вымерла б з голаду яшчэ раней расстрэлу.

Першы пагром адбыўся ў красавіку 1942 г. Мясцовая паліцыя − адна, без дапамогі з боку немцаў − уварвалася ў гета і пачала помсціць габрэям за гады, што былі пад савецкай уладай. На другую раніцу паліцэйскія загадалі групе моладзі выкапаць яму побач з габрэйскімі могілкамі. Арыштаваных габрэяў прывялі туды і расстралялі. Мы ў гета чулі водгукі шматлікіх аўтаматных чэргаў і адзіночных стрэлаў, якімі дабівалі параненых. Разам з маім дзядзькам Зальманам Фрэйманам былі забіты і многія нашы суседзі: Кацовіч, Фрыдман, Сосман, Блоч і іншыя.

Пасля гэтага пагрому многія яўрэі сталі будаваць схովішчы, каб хавацца на час наведвання немцаў.

Я працягваў працаваць, але на адпачынак я і мае родныя хаваліся ў бункеры. Пад кухняй, на глыбіні 2,7 м, была выкапана яма. Мы ўмацавалі яе тоўстымі палкамі, пад якія насыпалі шмат пяску. Уваходам у бункер быў

дымаход. Выйсці з бункера можна было ў сад, праз гэты ход паступала паветра. Такім чынам многія габрэі рыхтаваліся да другога пагрому.

Другая «акцыя» адбылася ў пачатку мая 1942 г. На світанку гета было акружана паліцыяй. Габрэі ў большасці сваёй пахаваліся ў бункеры. Але гэта мала дапамагло. Многія сховішчы немцы пазнаходзілі і ўсіх, хто там быў, расстралялі. Нашай сям'і пашанцавала больш. У сховішчы мы адсядзелі ўсю «акцыю». На наступны дзень выйшлі на вуліцы гета. Нашы вочы ўбачылі жудасную карціну. Забітыя ляжалі кучамі на вуліцах і дарогах, усё вакол было заліта крывёю, у дамах на пасцелях ляжалі забітыя людзі.

На мосце Песач Каплан сабіраў мазгі свайго маленькага дзіцяці, падарванага фашыстамі. Цельца маленькага больш не было, і хаваць, і плакаць бацьку не было над чым. Усе габрэі, якіх злавілі ў бункерах або сваіх дамах, былі сабраны ў месца ля клуба. Там немцы праверылі, хто з прысутных мае дазвол на работу. Іх пакінулі, а ўсіх астатніх падвялі да агульнай магілы і расстралялі. У гэтым пагроме загінула 350 габрэяў.

Ліквідацыя гета прыйшлася на канец мая 1942 г. Гэта здарылася ў суботу. У 4 гадзіны раніцы нас разбудзілі суседзі і паведамілі, што гета акружана, уцякаць не было куды. Як і раней, габрэі вырашылі, што могуць уратавацца, калі схаваюцца ў бункерах. У наш бункер схаваліся і суседзі, усяго 20 чалавек. Мы сядзелі ў яме, і нашы валасы craталіся на галовах ад жудасных крыкаў габрэяў, якіх выганялі немцы са сваіх дамоў.

У 8 гадзін раніцы фашысты напалі і на наш след, пачалі пошукі бункера з боку печы. Праз некаторы час, які для нас здаваўся самым доўгім у жыцці, пачуліся крыкі: «Жыды, выходзьце!». Ніхто не адказваў на гэтыя крыкі, і тады пачулася пагроза, што яны кінуць гранаты, калі мы не выйдзем. Заставацца ў сховішчы не было сэнсу. Я выйшаў першы. І адразу атрымаў удар палкай па шыі. Кінуўся бегчы, але быў збіты нагамі. Мяне акружылі гестапаўцы, білі, але я змог выскачыць у калідор і скочыць з балкона. Нечакана апынуўся каля групы людзей, і нас зноў акружылі гестапаўцы, потым сагналі ў адно месца, дзе ўжо знаходзілася некалькі дзесяткаў габрэяў,

і іх прыводзілі ўсё больш і больш. Некаторыя з маіх суайчыннікаў плакалі, іншыя ляжалі на зямлі, не маючы сіл падняцца. Да мяне падсеў Гдалія Левін і зашаптаў на вуха: «Уважліва паглядзі на гэтыя дрэвы і хаты, ты не ўбачыш іх больш. Усё гэта застанецца, але нас не будзе, нічога не зменіцца ў гэтым свеце, толькі не будзе нас». Я памятаю гэтыя словы да сённяшняга дня, яны адлюстраваліся ў маёй свядомасці назаўсёды. Калі нас назбіралася дзесьці чалавек 350, усіх пастроілі ў вялікую калону і пагналі да ямы, дзе раней расстрэльвалі габрэяў. Наша апошняя надзея на выратаванне знікала з кожным крокам на шляху да гэтай жудаснай ямы. Калі падышлі да месца расстрэлу, некаторыя з габрэяў спрабавалі ўцякаць. Але нікому з іх не пашанцавала. Усе былі забіты. У гэты час да мяне падышоў зондэрфюрэр Гартман і адазваў убок. Ён адвёў таксама майго бацьку, маю мачыху Гіту і яе дачку Хаю. Да мяне падбегла наша суседка Сара Маркман. Яна сказала зондэрфюрэру, што яна мая жонка. Усіх нас ён павёў у горад. Як потым мы зразумелі, сваім уратаваннем павінны былі дзякаваць таму, што добра валодалі спецыяльнасцямі шаўца і краўца. А ў гэты час ля ямы пачаўся расстрэл. Габрэям спачатку загадвалі распранацца, каб яны не сапсавалі крывёю вопратку і не змаглі схаваць каштоўнасцей, а потым забівалі.

Калі мы вярнуліся ў гета, то ўбачылі, што ўсё разбіта, разрабавана, а з розных схованішчаў, бункераў усё яшчэ працягвалі выводзіць габрэяў. Некаторыя з няшчасных забівалі сябе і дзяцей загадзя. Адна жанчына дала дзецям атруту і прыняла сама. Я ўбачыў прыгавораных да смерці прыгожых сясцёр Шлейфер. Яны былі апрануты толькі ў вельмі кароткія начныя кашулі. Дзяўчаты ўвесь час іх абцягвалі, саромеліся. Так амаль голых іх і павялі на смерць.

Знішчэнне Докшыцкага гета працягвалася 17 дзён, паколькі многія людзі хаваліся, а іх упарта адшуквалі. Усе спецыялісты, якіх немцы пакінулі ў жывых па адным ад кожнай прафесіі, 9 дзён знаходзіліся ў адным доме, не пакідаючы яго. За гэты час нас ні разу не кармілі, вады таксама не давалі. Як

мы пасля гэтага выглядалі, няцяжка ўявіць, але мы былі шчаслівыя, што засталіся жывыя.

У апошні дзень «ліквідацыі» была схоплена апошняя група габрэяў, каля 20 чалавек. Іх таксама расстралялі. Пасля мы даведаліся, што яны пратрымаліся так доўга, бо ўцяклі з гета і хаваліся ў руінах габрэйскіх дамоў на ўскраіне Докшыц, па шляху на Глыбокае. Іх знайшоў хлопчык-пастух і здаў у рукі паліцыі.

У чэрвені 1942 года ў Докшыцах не засталося ніводнага габрэя (***Дадатак 3)***.

Докшыцы былі вызвалены ў чэрвені 1944 г. Рэшткі габрэйскага насельніцтва горада, тыя, хто ваяваў у партызанах, паступова вярталіся. Сярод іх былі Іосіф Шапіра, я − Барыс Казініц, Я. і Б. Рэгіманы, Б.Фрыдман, сям'я Розавых і іншыя.

Пасля вызвалення ў горад пачалі прыходзіць лісты ад габрэяў, якія ўцяклі ад нацыстаў. Ад габрэяў − салдат Савецкай Арміі. Ад родных з ЗША, Ізраіля і іншых краін. Толькі адно пытанне было ў тых лістах − ці застаўся ў жывых хто-небудзь з родных? Яны прасілі знаёмых, суседзяў, добрых людзей напісаць, што здарылася з іх сем'ямі. Адказ быў адзін: «Нікога не засталося. Усе забітыя». Сам горад быў практычна поўнасцю разбураны. Было знішчана каля 90% пабудоў. Горад сам стаў могілкамі. Немагчыма было дыхаць у ім, немагчыма было жыць у ім аніводнага дня."

*Карта Докшыц з подпісамі на габрэйскай мове*

Гэта жудасныя ўспаміны, якія чалавек пранёс праз усё жыццё. Імкнуся зразумець яго боль, але гэта, напэўна, немагчыма… Можна толькі клапаціцца пра тое, каб жыла памяць народа пра гэтых людзей, якія сталі такімі ненавіснымі для Гітлера. Бо проста былі габрэямі… Бо проста жылі…

Але з успамінаў **Міхаіла Дзмітрыевіча Явіда** вынікае, што не толькі немцы здзекаваліся з габрэйскага насельніцтва. Ён падкрэслівае, што

асаблівае прыніжэнне і пагромы маёмасці чыніліся над габрэямі мясцовымі паліцаямі − ураджэнцамі Докшыц і навакольных вёсак, якія ведалі, хто бедны, а хто багаты, хто быў пасля 1939 года ў камсамоле, хто ўступіў у партыю, хто іх родзічы і г.д.

Габрэяў рабавалі таксама паліцаі. Немцы туды не заходзілі, паліцаі ж забягалі на тэрыторыю, хапалі ў каго вопратку, у каго гадзіннік, у каго швейную машынку.

Мясцовыя жыхары дапамагалі габрэям, давалі прадукты, хоць за гэта можна было “атрымаць гумы” ў камендатуры.

У час расстрэлу гета **сям’я Явідаў** схавала габрэйскага хлопчыка − Хаіма Кацмана, які жыве і зараз у Ізраілі і падтрымлівае з гэтай сям’ёй самыя добрыя адносіны.

Такім чынам, знаходзіліся людзі, што не баяліся ўзяць на сябе цяжкі, а ў тых абставінах вельмі страшны абавязак − дапамагаць. Дапамагаць, нягледзячы на небяспеку для свайго ўласнага жыцця.



*У с х ў з 0*

*чалавек. Падчас растрэлаў групе габрэяў удалося збегчы і затым уліцца ў партызанскае злучэнне.*

*У ліпені 2005 года у Параф’янава ўсталяваны абеліск у памяць аб загінуўшых габрэях з надпісам на іўрыце, беларускай і англійскай мовах.*

Параф’янава было мястэчка заможнае. Тут пражывала вялікая колькасць габрэяў. Крамы, што былі на станцыі, таксама з’яўляліся пераважна габрэйскімі.

Януковіч (Дамінеўская) Галіна Канстанцінаўна ўспамінае: “Я хадзіла ў школу разам з габрэямі. На ўрокі рэлігіі прыязджаў і ксёндз, і бацюшка, і равін.

На станцыі была адна крама, дзе прадавалі тэхніку (будынак бібліятэкі). Калі ты прыходзіў, а там не было чагосьці, то на наступны ж дзень гаспадар ехаў у Вільню і прывозіў тое, што трэба.

Адным з самых вядомых габрэяў у мястэчку быў Кастроль. Ён жыў у Параф’янаве і пасля вайны. Так атрымалася, што ляснічы паведаміў яму і яго брату, што габрэяў збіраюцца сагнаць у гета. Таму тыя паспелі ўцячы. Яны сталі членамі партызанскага атрада.

У нас былі дзве каровы. Адну мой бацька прадаў габрэю, упраўляючаму спіртзавода. Калі іх пачалі зганяць у гета, прыйшоў гэты габрэй да нас з просьбай: “Ой, Дамінеўскі, забяры ты сваю карову назад, можа, хоць малака калі дасі. Ты пастаў хоць якую галаву замест яе.” Бацька купіў іншую карову, завёў ноччу, замяніў. Ён быў у вельмі добрых адносінах з габрэямі, заўсёды іх абараняў. Як прыйшлі бальшавікі, у нас усё было павязана ў вузлы, чакалі з дня на дзень што вывезуць нас як кулакоў. І толькі дзякуючы габрэям нашу сям’ю не вывезлі. Яны вельмі паважалі майго бацьку. Страшны быў час. Кожны вечар ідзе са станцыі машына, палутарка. Чакаем, што едуць за намі. Прыязджаюць габрэі заспакойваюць: “Не бойся, Дамінеўскі. Ніводзін волас з тваёй галавы не ўпадзе” Такая моцная ўлада была ў іх.”

Увогуле, адзін з вышэйшых пастоў у мястэчку займаў таксама габрэй, Арон Левітан. Яго ж немцы і забілі першым, калі прыйшлі ў мястэчка.

Аповед пра знішчэнне параф'янаўскага гета пачну з успамінаў, што знайшла ў кнізе ізраільскага псіхолага Бар-Она "Спадчына маўчання". Гэта кніга змяшчае ўспаміны дзяцей тых людзей, што непасрэдна ўдзельнічалі ў страшнай справе Халакосту ў якасці выканаўцаў. Вось вытрымка з гэтай кнігі, што змяшчае размову з сынам немца, які быў пасланы ў Параф'янава падчас вайны.

"Рудольф адказаў на маю просьбу ў мясцовай газеце: "Дзеці, чые бацькі вінаватыя або прымалі ўдзел у ганеннях або ажыццяўленні праекта знішчэння ізраільскага народа, калі ласка..." Ён патэлефанаваў і сказаў, што будзе размаўляць толькі з ізраільскім карэспандэнтам. Мы назначылі час для інтэрв'ю і я згадзіўся сустрэцца з ім на аўтобусным прыпынку.

Як карэспандэнт я шукаў і меў поўную інфармацыю пра бацькоў і іх ролі падчас вайны, але для мяне адказчыкі былі таямніцай да той пары, пакуль яны не пачыналі расказваць свае гісторыі. Звычайна я прыходзіў на некалькі хвілін раней на месца сустрэчы, каб убачыць, як ідзе чалавек – як ён падыходзіць да прыпынку, як выглядае, здаецца ён спакойным ці не, ці змяняецца яго выраз твару, калі ён пазнае мяне. Аднак Рудольф ужо чакаў, паглядаючы на гадзіннік, хоць я і не спазняўся. Ён высокі і выглядаў як менеджэр мясцовай фірмы. Моцны поціск рукі. Я мог адчуваць яго хваляванне. Ён пачаў расказваць адразу, але я накіраваў яго размову у маленькую бяседу, таму што я хацеў дабрацца да свайго офіса, дзе быў уключаны дыктафон. Калі мы нарэшце дабраліся да майго пакоя і я запрасіў яго прысесці, ён выцягнуў жоўтыя лісты паперы са свайго партфеля.

Рудольф: Я нарадзіўся 4 красавіка 1930 года ў Вапертале, сын беспрацоўнага тэкстыльнага рабочага. Мой бацька ў той час не працаваў. Да таго як ён страціў працу, ён быў майстрам на тэкстыльнай фабрыцы. Аднак тады была вялікая колькасць беспрацоўных у гэтай мясцовасці і яго таксама звольнілі.

Бар-Он: Вы адзіны сын?

Рудольф: Я быў адзіным сынам да 1940 года, калі нарадзіўся мой брат. Ён і зараз жывы. Ён нарадзіўся 14 студзеня 1941 года ў Вапертале. Я правёў гэтыя раннія гады больш-менш прыемна да таго часу, пакуль мой бацька не знайшоў працу зноў. Я не памятаю, калі гэта было дакладна. Мы жылі ў зусім прымітыўным маленькім доме. Хоць ён быў без працы, аднак сам пабудаваў маленькі дом у садзе. Ён быў вельмі прадпрымальны і да самай смерці быў веруючым хрысціянінам. Дома мы маліліся, у нас былі гадзіны Бібліі, і мы спявалі разам. Былі таксама і іншыя, хто прыходзіў да нас пачытаць слова Божае разам.

Пасля бацька знайшоў новае месца працы. Ён быў назначаны рабочым на чыгунцы, яго пасылалі ў Расію і Польшчу. Калі больш дакладна, то ён быў пасланы ў Параф’янава. Гэта паміж Вільняй і Смаленскам. Ён працаваў, як гэта называлі падчас вайны, у якасці памочніка камандзіра рабочай групы. Быў вызначаны раён чыгункі, за які ён быў адказным. Гэта было паміж Параф’янава і Смаленскам, штосьці каля 300-500 км. Я не магу даць вам канкрэтную лічбу. Яго работа заключалася ў падтрыманні гэтага ўчастка чыгункі, які часта атакавалі партызаны. Яны ўзрывалі дарогі, такім чынам цягнікі сыходзілі з рэльсаў. Але самае важнае, што так паўплывала на мяне, было тое, пра што ён мне расказаў пасля свайго вяртання. У Параф’янаве было габрэйскае гета. Шмат габрэяў было сабрана разам і сканцэнтравана ў гэтым раёне, дзе ім дазвалялася жыць. Гэтыя габрэі таксама працавалі на нямецкай чыгунцы. Большасць была занятая тым, што дапамагалі рамантаваць дарогі. Напрыклад − я ўжо не магу забыць іх імёны − гэта быў Арон Кац, Марыя і кухарка, якая рыхтавала ежу людзям, з якімі працаваў мой бацька. Гэтая кухарка была габрэйкай. Я не ведаю яе імя. Але яе называлі Дола. Мой бацька мог наведваць гета і там размаўляць з габрэямі.

Так як ён быў перакананым і веруючым хрысціянінам, ён гаварыў з імі аб Святым Пісанні, аб Бібліі. І яны ведалі, што яны вераць у аднаго і таго ж

Бога. У любым выпадку яны разумелі, што яны роўныя. І мы, германцы, мы таксама адносімся да роду ізраільскага.

Настаў дзень, калі гета было акружана войскамі СС. Яны спыталі майго бацьку: “Колькі табе трэба?” і ён адказаў: “Мне патрэбны ўсе.” “Не, мне патрэбна шмат галоў, яны будуць расстраляныя” – сказаў афіцэр. І зараз ёсць такія добрыя хрысціяне з добрым дзіцячым сэрцам. Ён стаяў і не мог нічога зрабіць. Што ён павінен быў сказаць “Забі і мяне таксама”? У яго былі дзеці і жонка. Што ж ён павінен быў зрабіць? У яго не было такой вялікай смеласці. Ён не мог супраціўляцца. Ён быў не ў стане ўратаваць яўрэяў – пасля таго, як паміж імі наладзіліся такія ўзаемаадносіны, яны сталі яго братамі, ён жыў разам з імі. Спачатку была забіта жанчына. Днём раней яна нарадзіла дзіця. Яна была кінутая ў магілу. Яны забілі таксама і дзіця. Мой бацька не ведаў гэтага. Затым ён пабег і моцна плакаў. Малады салдат СС пабег за ім і сказаў: “Я не магу больш працягваць гэта! Я забіў і так шмат людзей. Я ўжо не магу больш”.

Пасля гэтага яго крытыкавалі. Я мог бы прачытаць вам пісьмо, якое напісаў мой бацька, каб праясніць падзеі. Гэта пісьмо, якое ён напісаў адразу пасля вайны. Ён быў вельмі хворым і быў звольнены са службы за свае перажыванні. Ён пісаў пісьмо пасля вайны, так як вельмі баяўся, што могуць забараніць пісаць гэта падчас вайны, падчас перыяду нацыянальнага сацыялізму. Дазвольце мне паказаць вам. Гэта вельмі старое пісьмо, і гэта падцвярджэнне таго, што мой бацька быў на ўсходзе.

(Яго рукі дрыжалі. Рудольф даў мне два дакументы, якія ён прынёс з сабой. Я мог бачыць, што яны вельмі старыя і захоўваліся акуратна ў нейлонавай сумачцы. Я таксама бачыў, што яны напісаны пажылой рукой і на адным з іх былі словы НАША ВІНА.

Я даў Рудольфу шклянку вады і прапанаваў яму самому прачытаць гэтыя дакументы мне. Пісьмо было ад 16 мая 1945 года):

“Нарэшце пасля некалькіх тыдняў сур’ёзнай хваробы, якая амаль адабрала ў мяне ўсе пачуцці, я знайшоў сілы, каб напісаць пра тыя рэчы, што

зрабілі мяне хворым і поўнасцю разбурылі мае нервы. Я паспрабую расказаць пра падзеі па парадку і растлумачыць, чаму выбраў такую назву свайму пісьму.

Да 1941 года на працягу многіх гадоў я актыўна працаваў дырэктарам нядзельнай школы для дзяцей. Наш прыход служыў для знешней і ўнутранай місіянерскай дзейнасці ў Кітаі. Мая галоўная задача заключалася ў тым, каб запрашаць да службы дзяцей. У мяне было шмат сяброў (дзякуючы маёй працы з дзецьмі). Партыя верыла, што яна знайшла вернага чалавека для сваёй нацыянальна-сацыялістычнай праграмы дзеянняў. У гэты час я працаваў для нацыянальнай чыгункі. Абапіраючыся на маю работу, я стаў членам Нацыянальнай сацыялістычнай Германскай Рабочай Партыі 1 чэрвеня 1941 года.

Мне таксама паабяцалі, што я захаваю сваю веру, але пасля таго як я стаў членам партыі, мне забаранілі ўтрымліваць нядзельную школу. Гэта быў першы ўдар. Я вымушаны быў маўчаць і адкласці маю любімую работу ўбок.

Я быў перакінуты ў мястэчка Параф'янава ў Польшу, каб працаваць упраўляючым. Гэта было 9 лютага 1942 г. Сярод іншых там было 247 габрэяў, мужчын, жанчын і дзяцей. Габрэі павінны былі выконваць розную работу, увогуле яны жылі ў закрытым гета. Мы, немцы (4 чалавекі), былі замацаваны за поварам-габрэйкай па імені Дола, прыгожай маладой дзяўчынай з рыжымі валасамі. Мае салдаты не адносіліся да яе з дастатковай павагай, так як яна была для іх перш за ўсё габрэйкай. Але хутка яна заўважыла, што ёсць нехта, хто адносіцца да яе з любоўю, і мы сталі сябрамі, хоць ніхто гэтага не заўважаў.

Аднойчы я захварэў на грып. Дола паклікала да мяне габрэйскага фармацэўта Бэлзіна, які здабыў для мяне цудоўнае лякарства. Мае падпарадкаваныя салдаты пачалі насміхацца з мяне, з сяброўства з габрэйкай, пачалі крытыкаваць і выказваць незадаволенасць. Калі я паправіўся, я першы раз наведаў гета. Наведванне гета было забаронена і за гэта маглі пакараць.

Дзякуючы маёй хваробе, мне было дазволена хадзіць у аптэку, якая была размешчана ў гета.



Тут было гета

Такім чынам я наведаў аптэкара і быў удзячны сустрэчы з такімі цудоўнымі людзьмі: габрэйскімі жанчынамі Марыяй (дачкой Белзіна), Рытай (настаўніцай) і Лілі (настаўніцай фартэпіана), таксама з сям’ёй Аэрона. Гэтыя людзі расказалі мне аб сваіх праблемах і трывогах. Перад маімі вачыма паўставалі расказы то пра адно, то пра другое гора. Гэтым габрэям, як маладым, так і старым, выдавалі норму ў 300 г хлеба ў тыдзень, гэта, і нічога больш з месяца ў месяц. Жабрацтва гэтых бедных людзей стала відавочным для мяне. Цяпер я стараўся як мог дапамагчы ім. Я быў вельмі шчаслівы, калі да нас далучыўся новы падначалены салдат, які падзяляў мае погляды. Ён рашуча кінуўся дапамагаць гэтым бедным людзям. Мы былі вымушаны рабіць гэта вельмі асцярожна, бо маглі наведваць габрэяў толькі позна вечарам, хоць яны былі кожны раз вельмі рады, калі мы прыходзілі. Я заўважыў, што іх трывогі растуць з кожны днём, таму што яны дзесьці чулі гаворкі пра тое, што габрэі будуць забіты. Кожны раз яны пыталіся: “Што будзе з намі?” Я імкнуўся растлумачыць ім, што Усявышні не пакіне іх. Дома, у сваім пакоі, я горача прасіў Бога аб дапамозе. Так, у маёй скрусе я гаварыў: “Госпадзе, я буду служыць табе верна, толькі зрабі так, каб гэтыя людзі жылі.” У выніку гэтага страшэннага смутку і жабрацтва нашы адносіны сталі вельмі цеснымі. Гэта зайшло так далёка, што мы разам апускаліся на калені прасіць у нашага Айца сілы ва ўсіх справах. Аднойчы вечарам, калі я наведаў іх зноў, мы сядзелі разам і я заспяваў песню “Добрай раніцы, дабранач” пад гітару. Калі мы дайшлі да слоў “Заўтра, калі Бог пажадае, цябе разбудзіць ізноў...” Рыта

заплакала і сказала: “Я адчуваю штосьці дзіўнае”. Апошнія словы, якія яна сказала, патанулі ў слязах. Гэта была апошняя ноч яе маладога жыцця.

Раніцай наступнага дня мы раптам пачулі, што гета было захоплена СС. Габрэяў сабралі разам і выгналі на вуліцу. Тут яны павінны былі зняць абутак, паліто і курткі. Яны пачалі плакаць.

Чатырнаццацігадовы хлопец паспрабаваў збегчы, аднак яго забілі. У адказ адзін габрэй вельмі абурыўся і пачаў лаяць СС, аднак яго жорстка збілі і вымушаны былі несці на насілках. Людзей з вёскі прымусілі выкапаць вялікую яму і кожны,– дзеці і жанчыны, маладыя і старыя, павінны былі легчы тварам у зямлю. Сярод гэтых няшчасных людзей была жанчына, якая нарадзіла дзень назад. Яна была першай, хто пайшоў да магілы. Я бачыў, як яна кавыляла, гайдаючыся, і несла на руках амаль голае дзіця. Яна плакала і маліла пакінуць яго жывым. Яе груба штурхнулі ў яму і затым забілі.

Я як мага хутчэй пайшоў у свой пакой, зноў і зноў чуў выстралы, зваліўся на ложак. Зараз я страціў усё. Я ішоў за Бога 28 гадоў і зараз адбылося гэта жудаснае здарэнне. Я верыў амаль да апошняй гадзіны, што Бог захавае гэтых людзей у выніку маёй малітвы, але потым пракляў Бога і ўсіх людзей.

Я жадаў поўнага забыцця. Пакінуты Богам і ўсімі людзьмі, я выконваў свае абавязкі ў поўнай апатыі і не ведаў, што будзе са мной далей.

Мае падначаленыя, за выключэннем С., называлі мяне баязліўцам і любіцелем габрэяў. Габрэі былі расстраляныя паўсюдна: у Глыбокім, Докшыцах, Будславе і Круляўшчызне. Калі я прыехаў у Докшыцы праз 10-12 дзён, то сустрэў там капітана. Першае, што ён спытаў было: “Дзе Марыя?” (Марыя была дачкой фармацэўта з Параф’янава). Я сказаў, што Марыя загінула. Капітан пачаў плакаць. Ён схапіў маю руку і сказаў: “Гэта страшная ганьба”. Я не бачыў яго пасля гэтага, але ведаў, што яго сэрца сцякае крывёй. 1800 габрэяў было расстраляна ў гэтым горадзе. Было шмат слёз. Я пабег паглядзець, што здарылася і ўбачыў габрэяў, якія выходзілі з падземнай схованкі, каля 80 ці 100 людзей. Яны прасілі вады, іх твары былі белыя, як

мел. Не ў стане сказаць што-небудзь, яны кідаліся на калені і прасілі пакінуць іх жывымі. Іх не слухалі і заганялі, як статак, у хлеў. Я бачыў, як дзяўчынку гадоў дзесяці, якая хавалася ў сене пад навесам і была амаць поўнасцю знясілена, цягнулі ззаду за мной. Гэта бедная дзяўчынка была больш падобна да кучы касцей, чым да чалавека, і гэты вузел жабрацтва і мучэння таксама кінулі ў хлеў. Я ніколі не забуду гэты страшны погляд і не магу дапамагчы сам сабе. Гэта было настолькі жудасна, што зрабіла мяне хворым на ўсё астатняе жыццё. Я не магу зразумець, як людзі могуць быць такімі звярамі. Гэтыя карціны часта бачу ноччу і днём.

Праз некалькі тыдняў мяне паслалі ў палявы шпіталь у Вілейцы па прычыне гіпертаніі. Але там я поўнасцю ўпаў духам, з той пары мне не дазвалялася нікому казаць пра мае мучэнні. І гэтыя мучэнні станавіліся ўсё больш цяжкімі, калі я ўявіў сабе, што я член банды забойцаў і злачынцаў, банды, якая пазбавіла б мяне жыцця, калі б я стаў пярэчыць. Такім чынам я адчуваў сябе горш і горш і мяне паслалі ў Вільна. Там у мяне знайшлі ўнутранае расстройства. Яны не ведалі прычыны і задавалі мне розныя пытанні, але я так і не сказаў ім нічога, бо не мог давяраць нікому, нават урачам. Пасля гэтага мяне паслалі дадому ў Германію ў суправаджэнні салдата. Калі я вярнуўся дадому, мой стан пагоршыўся, так як я не мог працаваць адзін, так як я мучаўся ад вельмі вялікай вагі тых падзей, якія перажыў. Праз некаторы час мясцовы камітэт партыі папракнуў мяне за ненацыянальна-сацыялістычны пункт гледжання на рэчы. Мой светапогляд быў рэлігійнай арыентацыі. Калі я хацеў пагаварыць аб маіх перажываннях, я вымушаны быць вельмі асцярожны, і гэта рабіла мяне вельмі хворым. Доктар Д. рашыў, што мяне лепш змясціць у інстытут. Я баяўся, што яны збіраюцца пазбавіцца ад мяне там... Карацей, я вымушаны быў легчы ў гарадскую бальніцу (клініку) для абследавання. Тут я прызнаўся ва ўсіх маіх муках доктару Л. і растлумачыў усё яму. Доктар Л. не належаў да партыі. Ён цалкам зразумеў мяне і параіў пастарацца забыцца на рэчы − тое, што было і ёсць немагчыма.

14 красавіка 1945 года да мяне раптам падышоў чалавек на вуліцы. Ён сказаў: "Я ведаю, хто Вы. Вы падрываеце работу партыі. Вы брудны сабатажнік, і гэта будзе каштаваць Вам жыцця.". Я зрабіў некалькі крокаў і ўпаў на месцы. Сведкі гаварылі, што я нешта гаварыў аб забойцах, карычневых бандытах і расстрэлах габрэяў. Людзі думалі, што я звар'яцеў. Я заставаўся у такім стане некалькі дзён. Я быў хворы і не мог працаваць з 17 верасня 1944 года. Але зараз я поўнасцю быў знішчаны. Доктар Л. і доктар Ж. былі каля майго ложка. Калі я крыху апрытомнеў, я спытаў самога сябе:"Што я зрабіў?"

Я давяраў некаторым сем'ям і расказваў ім аб зверствах у Расіі. Ці маўчалі яны, я не ведаю. Я таксама не выдаў чалавека, які жыў далёка ад сваёй часці на працягу паўтара года, аб кім у мяне часта распытвалі. Я хаваў яго як мог. Я не мог дазволіць яму трапіць у рукі тых, хто хацеў пабудаваць так званы "рабочы рай" на крыві і касцях загінуўшых.

3 ці 4 мая, калі доктар наведаў мяне, я расказаў яму аб усім, асабліва аб Расіі. Я магу сказаць, што ён вельмі плакаў і яму было сорамна (дакумент неразборлівы).

Я не давяраў Богу ў Параф'янаве, але сёння я прасіў у яго прабачэння. Ён не быў на баку тых, хто чыніў такія несправядлівасці, і ён адкупіў тыя крывавыя справы".

Рудольф: Гэта канец пісьма. Гэта было перажытае. І дазвольце мне сказаць вам, што гэты чалавек мучаўся да самага канца, да той пары, пакуль не памёр 8 гадоў таму назад.

Бар: Ці былі ў вас сябры-габрэі ў школе? Ці вучыліся ўвогуле габрэі ў вашай школе?

Рудольф: Не, нікога. Пачакайце... Была адна. Яна была напалову габрэйкай. Я пайшоў у школу ў 1936 годзе. Мы не ведалі спачатку, хто быў напалову габрэем. Я нядоўга правучыўся ў гэтай школе. Яна ж расказвала пасля вайны, што іншыя дзеці распранали яе дагала на вуліцы, бо пачулі, што яна напалову габрэйка. Нават падлеткам і дзецям быў навязаны такі пункт

гледжання, што яны могуць здымаць адзенне з аднакласніка і крычаць: “Габрэй, габрэй!” Яна і зараз жыве тут, выйшла замуж за англічаніна. Яна казала, што не хацела б выйсці замуж за немца.

Пасля запісу мы гулялі разам, і Рудольф сказаў, што яго дзеці не хацелі, каб ён куды ішоў, яны хацелі пакінуць мінулае ў мінулым. Я раптам уявіў сабе, як доўга ён зберагаў пісьмо свойго бацькі.”

Гэты аповед прымушае яшчэ раз задумацца над тым, хто або што на самай справе вінавата ў трагедыі габрэйскага народа.

Шмат людзей было забіта ў Параф’янаве. **Вайцяховіч Яніна Іванаўна**, якая ў той час была маленькай дзяўчынкай, расказвае, што яе бацька хадзіў адзін дзень на станцыю (самі яны жылі ў суседніх Шантарах, зараз гэта частка Параф’янава). Прыйшоўшы, ён сказаў, што, напэўна, будуць біць габрэяў, бо ўжо выкапалі яму.

*Яніна Іванаўна:* “Хутка і сапраўды пачуліся стрэлы. Габрэяў гналі ў калоне па чатыры чалавекі. Ім сказалі, што павязуць на цягніку ў Амерыку: схлусілі, каб тыя не разбягаліся і ўзялі з сабою свае грошы (у іх былі залатыя капейкі). Ішлі яны, такія шчаслівыя, але потым убачылі, што вядуць іх не на вакзал, а да выкапанай ямы. І вось гляджу я: дзяўчынка гадоў дванаццаці – чатырнаццаці ў такой яркай ружовай сукеначцы аддзялілася ад гэтай калоны і пабегла… Шмат так прабегла, амаль да нашых дамоў… А потым яе дагнала куля… Я памятаю, як яна падала… Пасля праз некаторы час да яе падышлі двое, узялі за рукі і пацягнулі. Гэтая сцэна − самы страшны ўспамін на ўсё маё жыццё…

Пасля таго, як была праведзена аперацыя, яма так доўга краталася… Там, відаць, было шмат не забітых, а толькі параненых. Прайшло некалькі тыдняў, і яма пачала моцна смярдзець, бо выкапана была неглыбока. І хлоркай яе сыпалі, і іншыя меры прымалі, але нічога не атрымлівалася… Нельга было схаваць сляды жорсткасці і насілля…

Вось такая сумная гісторыя.”

Аднак, як аказалася, некаторым габрэям удалося ўцячы. Вядомы два такія выпадкі: выратаванне Кастроляў і Гейдэнсонаў.



*Параф’янаве*





*Адкрыццё помніка ў Параф’янаве*

# Бягомльскае гета

***Бягомль**, пасёлак гарадскога тыпу (з 1938) у Докшыцкім раёне Віцебскай вобласці. З 1793 - у складзе Расійскай імперыі, у Барысаўскім уездзе Мінскай губерніі.*

*У 1915 годзе ў Бягомлі адбыўся пагром, які быў учынены казачымі часткамі рускай арміі. Напярэдадні, жаночая частка габрэйскага насельніцтва пакінула Бягомль, даведаўшыся пра набліжэнне казакаў.*

*У 1939 годзе ў Бягомлі пражывала 206 габрэяў, у 1970 - 4 (0,14%), у 1989 - 3 габрэя (0,09%).*

*2 кастрычніка 1941 года ў Бягомлі было расстраляна 270 габрэяў, 16 кастрычніка таго ж года – 23 габрэя.*

## Успаміны Розава Сямёна Юдавіча

Пра сваіх дзядах і прадзедах я ведаю, на вялікі жаль, вельмі мала. Мой дзед, бацька майго бацькі, - Розаў Майсей памёр у 1892 годзе. Гэта ўсё, што мне вядома пра яго. Аб бабулі з боку бацькі мне і зусім нічога не вядома.

Мой бацька - Розаў Юды Майсеевіч, 1880 года нараджэння, жыў у вёсцы Даўгінава былога Бягомльскага раёна Мінскай вобласці, затым у вёсцы Вускрам'е. У 1934 годзе ён купіў невялікі дом у вёсцы Ваўча.

